# Ад аўтараў

Пад канец XX стагодзьдзя ў гісторыі беларускага народу адбылася важная падзея — Беларусь стала незалежнай дзяржавай і цяпер зьяўляецца сувэрэннай суседкай незалежнай Польшчы. Аднак Беларусь будуе сваю незалежнасьць зусім іначай, чым Польшча, а палітычны, эканамічны і культурны выбар, які робяць беларусы, часам выклікае ў палякаў зьдзіўленьне. Разуменьне адметнасьці беларусаў, якая вынікае зь іх нялёгкай і складанай гісторыі, патрабуе як мага больш аб'ектыўнага выкладаньня гэтай гісторыі. Магчыма, чытач палічыць некаторыя меркаваньні аўтараў крыўднымі для палякаў, а іншыя — неапраўданымі. Аднак мы намагаліся браць пад увагу і беларускі пункт гледжаньня, хоць і без празьмернага шанаваньня беларускіх гістарычных мітаў.

Рэспубліка Беларусь мае акрэсьленыя межы, прызнаныя ўсімі суседзямі і міжнароднай супольнасьцю. Тым ня менш, падзеі беларускай гісторыі адбываліся ў нашмат шырэйшым тэрытарыяльным абсягу, таму ў працы часта фігуруюць такія гарады, як Беласток, Смаленск і, перш за ўсё, Вільня, якая да сярэдзіны XIX ст. і яшчэ раз у пачатку XX ст. выконвала ролю культурнай сталіцы Беларусі.

У польскай гістарычнай літаратуры пануе тэндэнцыя падзяляць беларускае грамадзтва фэадальнага пэрыяду на польскую шляхту і беларускі люд. Падобныя сьцьверджаньні можна было пачуць з вуснаў аўтарытэтных гісторыкаў нават на апошнім, XVI Усеагульным зьезьдзе польскіх гісторыкаў. Гэта — антыгістарычнае мысьленьне. Калі лічыць народ ідэйнай супольнасьцю, то беларускага народу да XX ст. у такім выглядзе папросту не было. Калі беларусам ня быў памешчык, афіцэр, навуковец ці паэт, то тым больш ня быў ім селянін. Усялякія ўзаемаадносіны розных сацыяльных пластоў адбываліся паміж аўтахтонамі, нашчадкі якіх сёньня зьяўляюцца беларусамі, палякамі ці расейцамі. Пры гэтым фармаваньне сучаснага беларускага народу было складаным працэсам; у ягоны склад увайшла частка шляхты (а таксама габрэяў), затое не ўвайшла частка сялян–каталікоў. Таму нельга падзяляць тагачаснае беларускае грамадзтва на "польскую" шляхту і "беларускі" люд (як таксама, што яшчэ горш, на "польскіх паноў" і "беларускіх мужыкоў").

Як у польскай, так і ў беларускай гістарыяграфіі прынята лічыць этапнай для гісторыі абедзьвюх краінаў дату апошняга падзелу Рэчы Паспалітай — 1795 год. На нашу думку, такі падыход у дачыненьні да гісторыі Беларусі некарэктны. Калі казаць пра падзелы, дык ужо ў выніку першага падзелу 1772 г. большая частка беларускіх земляў, да таго ж самых багатых і найболыш шчыльна заселеных, апынулася пад расейскім панаваньнем. Акрамя таго, працэс далучэньня населеных беларусамі земляў да Расейскай імпэрыі ня скончыўся і ў 1795 г., а працягваўся да 1815 г., калі пад расейскай уладай апынулася паўднёвае Падляшша ў межах Царства Польскага. А паколькі мы маем дачыненьне з працяглым працэсам паглынаньня беларускіх земляў Расейскай імпэрыяй, то, на нашу думку, зусім дарэчы будзе нагадаць, што гэты працэс быў адноўлены спробай ліквідацыі аўтаноміі Смаленшчыны, зробленай Кацярынай II яшчэ да першага падзелу Рэчы Паспалітай, а яшчэ раней была спроба імпэратрыцы Лізаветы забраць ад Рэчы Паспалітай усходнюю Беларусь. Таму мы палічылі патрэбным распачаць выкладаньне падзеяў зь сярэдзіны XVIII ст., калі стан адноснай цывілізацыйнай раўнавагі зьмяніўся вельмі магутным памкненьнем да мадэрнізацыі дзяржавы і грамадзтва як у Рэчы Паспалітай, так і ў Расеі, якая перайшла да чарговага этапу рэформаў. Мадэрнізацыйныя працэсы ў абедзьвюх краінах былі падобныя адзін да аднаго (улічваючы адста-

ваньне Расеі). Празь некалькі дзесяцігодзьдзяў нявызначаным было толькі пытаньне, паводле польскага ці паводле расейскага ўзору будзе мадэрнізавацца Беларусь. Сіла Расейскай імпэрыі перадвызначыла тое, што Беларусь у часы цараваньня Мікалая I канчаткова была змушаная прыняць расейскі ўзор, а ў XX ст. — савецкі. Дзеля гэтага гісторыя Беларусі зь сярэдзіны XVIII ст. да канца XX ст. — гэта гісторыя цывілізацыйнага адасабленьня ад Польшчы гэтай краіны і яе сучаснай нацыі, якая толькі фармавалася.

Бібліяграфічныя заўвагі, пададзеныя ў працы, перш за ўсё датычаць агульнай літаратуры па тэме на польскай мове. Працы на беларускай мове ўлічваліся ў абмежаваным аб'ёме, бо ў Польшчы яны проста недаступныя.

На дадзены момант гісторыя Беларусі дачакалася на польскай мове толькі адной агульнай працы — "Гісторыі Беларусі" Марцэлія Космана. Гэтая праца ўжо састарэла, улічваючы як год яе выданьня (1979), так і зьмест. З таго часу гістарыяграфія Беларусі зрабіла значныя крокі наперад. У апошнія гады зьявіліся яшчэ дзьве працы, якія ахопліваюць гісторыю ўсіх беларускіх земляў за больш кароткія гістарычныя пэрыяды: "Беларусь у другой палове XIX стагодзьдзя" Станіслава Ланеца і "Беларусь" Яўгена Мірановіча, прысьвечаная гісторыі гэтай краіны ў XX ст. Гэты ж падручнік быў створаны адпаведна з зацьверджанай Міністэрствам нацыянальнай адукацыі праграмай вывучэньня беларускай і рэгіянальнай тэматыкі ў якасьці дадатку да праграмы вывучэньня гісторыі ў пачатковых і сярэдніх школах у былым Беластоцкім ваяводзтве, распрацаванай Яўгенам Вапам. Таму адносна шырока ў ім выкладаецца гісторыя беларусаў на Падляшшы, з асаблівай увагай да гісторыі асьветы. Хоць падручнік прызначаны для настаўнікаў, мы ўсё ж такі маем надзею, што ім будуць карыстацца таксама студэнты, ліцэісты і ўсе чытачы, якія цікавяцца гісторыяй Беларусі і беларусаў у Польшчы.